**А.І.Непачаловіч,**
*ст. выкладчык*

# АД КРЫНІЦ СТАРАЖЫТНАГА НАРОДНАГА ТКАЦТВА ДА СУЧАСНЫХ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ МАЛАДОГА ПАКАЛЕННЯ

Намаганнямі шматлікіх навуковых дзеячаў у галіне народнага мастацтва Беларусі адраджаюцца і захоўваюцца ў скарбонцы нацыянальнай культуры унікальныя тэхнікі і спосабы выканання прадметаў розных відаў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Дзякуючы плённай працы даследчыкаў, мы маем магчымасць у наш час знаёміцца з цудоўнымі старажытнымі і сучаснымі творамі народных майстроў Беларусі.

У рамках навукова-творчай лабараторыі "Традыцыйныя рамёствы беларусаў" у майстэрні мастацкага ткацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры праводзіцца навуковая работа па выяўленні малавывучаных і страчаных тэхналогій народнага ткацтва. У працэсе вывучэння матэрыялаў аб мастацкіх двухасноўных тканінах Заходняй Беларусі — славутых гродзенскіх дыванах — цікавасць уяўляе дзейнасць польскай мастачкі прафесара Э.Плутынскай. З незвычайным спосабам ткацтва Плутынская ў 30-я гг. XX ст. пазнаёмілася ў гродзенскім музеі. Яна шмат вандравала па вёсках Гродзеншчыны і была захоплена своеасаблівымі ўзорамі вырабаў, тканых у двухасноўнай тэхніцы. Мастачка карысталася парадамі вядомага навукоўца, арганізатара і першага дырэктара Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Ю.Ядкоўскага, які на працягу дваццаці гадоў вывучаў асаблівасці мясцовых падвойных двухасноўных тканін. У 1934 г. Плутынская знайшла ў тых вёсках, якія былі вызначаны Ядкоўскім у 1928 г. у якасці цэнтраў бытавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падвойнага ткацтва, ткачоў, якія валодалі гэтай складанай тэхнікай. У в. Янава на Беласточчыне яна вывучыла тэхніку падвойнага ткацтва ад патомнага ткача Адольфа Ярашэвіча і яго жонкі Феліцыі і, захопленая багаццем ўзораў і мастацкай выразнасцю тэхнікі, пачала выкарыстоўваць яе ў сваіх творчых работах. Плутынская давала парады ткачам з гуртка в. Янава. Пад яе кіраўніцтвам ткаліся дываны на падставе старадаўніх узораў гродзенскіх дываноў. У 1938 г. у Берліне на Міжнароднай выстаўцы мастацтва і рамяства Э.Плутынская разам з янаўскім гуртком ткачоў атрымала залаты медаль за гродзенскія тканіны. У той жа час яна падрыхтавала ў Варшаве разам з Інстытутам прапаганды мастацтва выстаўку "Мастацтва ткацтва на вёсцы". На выстаўцы экспанаваліся даўнія гродзенскія дываны разам з сучаснымі. Сучасныя дываны былі выраблены янаўскімі ткачамі дзякуючы парадам Плутынскай. Майстры кампанавалі свае ўзоры непасрэдна на ткацкім стане. Узоры ўзнікалі "з галавы". Атрымаліся незвычайныя па кампазіцыйным і каларыстычным рашэнні творы. З'явіўся новы кірунак у развіцці падвойнага ткацтва, нарадзіўся пэўны тып мастацкай тканіны. Да гэтага янаўскія ткачы займаліся капіраваннем узораў з купленых кап ці альбомаў.

У 1939 г. супрацоўніцтва Элеаноры Плутынскай з мясцовымі ткачамі было перарвана. Пасля вайны яна вярнулася ў Янава і прадоўжыла сваю дзейнасць. Вынікам гэтай нястомнай працы мастачкі з'явілася тое, што падвойныя тканіны атрымалі сусветную вядомасць і поспех, але, на жаль, сталі своеасаблівай візітоўкай Польшчы, а не Беларусі.

Паміж кірункам працы з народнымі майстрамі Э.Плутынскай і дзейнасцю па навучанні студэнтаў у майстэрні мастацкага ткацтва можна прасачыць агульныя рысы. У майстэрні студэнты ў тэарэтычным курсе вывуча-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юць развіццё старадаўняга і сучаснага ўзорнага ткацтва. Творы студэнтаў выконваюцца як па эскізах і тэхналагічных разліках навучэнцаў, так і экспромтам, што нагадвае распрацоўкі янаўскіх ткачоў "з галавы". Галоўнымі задачамі практычнага курса навучання студэнтаў з'яўляюцца асваенне асноўных традыцыйных айчынных спосабаў ткацтва; вывучэнне тэхналогіі ткацтва; набыццё ведаў аб дэкаратыўнай кампазіцыі, яе рытмічнай і каларыстычнай арганізацыі; развіццё у студэнтаў здольнасці выяўлення пластычнай асаблівасці матэрыялу і прасторавага мыслення. Заняткі па вырашэнні гэтых задач таксама нагадваюць работу Э.Плутынскай з народнымі майстрамі. Атрыманыя веды ў майстэрні мастацкага ткацтва дапамагаюць фарміраванню ў студэнтаў паняцця аб культуры пераемнасці традыцый і выхоўваюць імкненне да адраджэння і развіцця народнага ткацтва Беларусі.

**З.М.Пасютина,**
*доцент*

## ТЕАТРАЛЬНЫЙ ДИАЛОГ: БЕЛАРУСЬ — ШВЕЙЦАРИЯ

В предлагаемой статье мы обращаемся к пьесе швейцарского драматурга К.Халлера «Игры богов» («Götterspiele») и одноименному спектаклю «Гульні багоў» (режиссер З.Пасютина), поставленному на сцене Республиканского театра белорусской драматургии. Кристиан Халлер — необыкновенно многогранный, разносторонне одаренный драматург, освещающий разные темы и использующий разные формы для выражения.

Профессиональная карьера этого человека шла зигзагообразным курсом. Он родился в Бругге в 1943 г. Каза-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ